

# Наталія ЧАКУН

Наталія Васільеўна Чакун нарадзілася на Гродзеншчыне ў вёсцы Заполле (Мастоўскі раён). Скончыла Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы. Настаўнік беларускай мовы і літаратуры Дзяржаўнай установы адукацыі «Гімназія № 5 імя У. С. Караткевіча г. Гродна».

Вершы пачала пісаць яшчэ ў дзяцінстве – з сёмага класа. Тады і выступіла першы раз у друку – у раённай газеце «Зара над Нёманам». Затым пачала рэгулярна друкавацца ў часопісе «Бярозка». Дзяўчыну тры разы запрашалі ў Мінск на здымкі ў тэлепраграме для вучняў, якія самі пішуць вершы. Два разы з вершамі выступала ў раённай радыёпраграме «Таленты Мастоўшчыны». У старэйшых класах падчас зімовых і вясенніх канікул Наталія ездзіла ў Мінскі Інстытут беларускай літаратуры на заняткі для адоранай творчай моладзі.

Дзяўчынка вельмі рана навучылася чытаць і многа вершаў з дзяцінства ведала на памяць. Любімым заняткам заўсёды было чытанне, любоў да якога прывіў бацька. Чытала ўсё, што трапляла ў рукі: фантастыку, прыгодніцкую літаратуру, дэтэктывы, паэзію – на рускай і беларускай мовах. Захаплялася творчасцю Якуба Коласа, Ясеніна і Пушкіна. Калі пачала спрабаваць пісаць свае вершы, то ў ролі дарадчыка і крытыка заўсёды выступаў бацька, Васілій Дзмітрыевіч Пронька (для дзяўчынкі было вельмі важна пачуць менавіта яго пахвалу).

Вершы Наталіі Чакун друкаваліся ў Брэсцкай абласной газеце «Зара», у газетах «Гродзенская праўда», «Перспектыва», «Зара над Нёманам», «Вестник ВХС», у абласным штогадовым альманаху «Галасы», у зборніку «Роздум аб вайне», у зборніку творчых і навукова-даследчых работ вучняў і педагогаў «Жамчужына»; артыкул быў надрукаваны ў «Настаўніцкай газеце» і ў рэспубліканскім часопісе «Беларуская мова і літаратура».

У 2019 годзе ў паэтэсы Наталіі Чакун выйшаў дэбютны зборнік вершаў «Цвітуць сады». Сёлета (2023) паэтэса выступіла ў Гродзенскім дзяржаўным медыцынскім універсітэце (ГрДМУ). Жыве ў горадзе Гродна. Піша на беларускай мове.

---

## ТЫТУНЬ – НЕ СЯБАР

Два сябры, Алег і Коля,
У адным жылі двары.
Дружба моцная даволі,
Што ўжо тут ні гавары.

І заняткі дзеляць разам:
Вось Алег на скейце мчыць,
Коля тут як тут адразу,
Бо сяброў не разлучыць.

У гуртку пры школе Коля
Клеіць спрытна караблі.
Лайнер і Алег адолеў,
Бо сюды ж удвух прыйшлі…

Час ідзе… Хлапцы-падлеткі
Памужнелі, падраслі.
І ў сямнаццаць год улетку
Іх дарогі развялі:

Коля ў дактары падаўся,
І жыцця здаровы лад
Выбраў і не сумняваўся,
Што ў яго такі расклад.

Што ж Алег? Змяніўся з часам
(За баранкай дзень пры дні),
Стаў да тытуню ён ласы,
А да спорту ён — ані!

Зубы жоўтыя ў шчарбінах.
Нездаровы шэры твар.

Хворы з выгляду мужчына:
Курыць дзесяць год запар.

Голас так хрыпіць, што кола,
І задышка ўсё мацней.
— Не куры, — прасіў Мікола.
Той і слухаць не хацеў.

У свае няпоўных трыццаць
Наш Алег — нібы стары.
Не жадае ён спыніцца,
Што яму ні гавары.

Так, тытунь з сяброў не лепшых:
Кашлем лёгкія здушыў.
Апусціў герой наш плечы,
У лякарню ён пабрыў.

Доўга з тытунём Алежка
Вёў нябачную вайну:
Ён марудліва, няспешна
Мяў цыгаркі — не адну.

Каб спагнаць спакусу гэту,
Пра заганнае забыць,
Узімку плаваў, бегаў летам,
Бо здароўе не купіць.

І з Алегам побач — Коля
(Без падтрымкі тут ані):
— Цыгарэтам — не! Даволі!
Ад сябе ты іх гані,

Імі сэрца не спатоліш,
І душу не разаўеш,
Лепш, — сказаў разважна Коля, —
Ты марозіва паеш!

# ЯНКУ КУПАЛУ

Я сустрэўся з табой на “Кургане”,
Каб нам разам ісці па зямлі,
Любавацца вясеннім світаннем,
Удыхаць пахі свежай раллі.

Пасядзець ля хаты ў Вязынцы
І “Жалейкі” паслухаць спеў:
Словы льюцца, хаваюцца, дражняцца…
Я заслухацца імі паспеў.

І, здаецца, здалёку чую:
-Азірніся! “А хто там ідзе?”
Хто ўслаўляе мову святую,
Якой больш не пачуеш нідзе?

Нам яна перададзена ў “Спадчыну”,
І “Нікому” яе не зламаць,
Бо “Адвечная песня” матчына
Ў “Час” любы будзе горда гучаць.

І не будзе “гняздо раскіданым”,
Ні “За што” не заплача душа,
“Зоркі” ўспыхнуць над краявідамі,
Быццам кропелькі, задрыжаць.

Мы не станем з табой “Тутэйшыя”,
Бо ад сэрца пачуцці ідуць.
Хай звіняць нашы словы лепшыя
І да лепшага нас вядуць…

Я ж сустрэўся з табой на “Кургане,”
Каб прайсці тваім “Шляхам жыцця”,
Бо пад час веснавога світання,
Нібы птушкі, думкі ляцяць.

# КРАЙ МОЙ РОДНЫ

Край мой радзімы – бацькоўская хата:
Рэкі, азёры, лясы і палі.
Заўсёды сябрамі ты будзеш багаты
Толькі на любай сэрцу зямлі.

Полацк і Тураў, Міндоўг і Рагнеда…
Хуткая Свіслач ды Нёмана сінь…
Песні бабулі і прымаўкі дзеда
Поля жытнёвага ціхая плынь.

Пушчы старыя й магутныя зубры.
Клін журавоў у нябёсах ляціць.
Люд працавіты. Добры і мудры.
Як мне краіну сваю не любіць?!

***

Я хачу прайсці ў жыцці
Самай лепшай сваёй дарогай.
Час, як ведаем, хутка ляціць,
А паспець трэба вельмі многа.

І пакінуць такія сляды,
Каб не сорам было азірнуцца
І тварыць, пакуль малады,
Пакуль сілы ўвысь імкнуцца.

Безупынна ўносіць уклад
Справай добрай, заўсёды новай.
Не вяртацца з дарогі назад,
Хай чужой, хай зусім невядомай.

Светлай будучыню каваць,
Уздымацца да самых вяршыняў.
Мовай роднаю край услаўляць,
Шчырай, цёплаю і адзінай...

Я хачу прайсці ў жыцці:
Добры след свой пакінуць навекі.
Кветку шчасця нарэшце знайсці,
Стаць карысным для ўсіх чалавекам.

* * *

“Зноў горад будзе “фестываліць”, —
Сыночку сёння я сказала.
Не зразумеў маленькі, мабыць.
Падзея ж гэтая цікава.

“А фестываль таксама свята?” —
Адказу ад мяне чакае.
“Прыедзе к нам гасцей багата,
З усіх куточкаў завітаюць.

Такая наша ўжо краіна,
Якую кожны лічыць домам:
Тут побач рускія, грузіны,
Палякі, латышы… Вядома,

Ва ўсіх ёсць чым здзівіць суседа,
Гасціннасць выказаць спаўна.
Завуць на шумную бяседу
Ад раніцы і дацямна.

Цыганы з песняй карагодзяць,
Азербайджане ў бубен б’юць…
Бывае, часу і не хопіць
Ва ўсе падворкі зазірнуць…

Ды што казаць? На гэткім свяце
Лепш трэба пабываць самому.
Адтуль духоўнае багацце
Ты возьмеш, сапраўды, дадому”.

Мы сталі месяцы адлічваць:
На чэрвень толькі б не забыць.
У календары чырвонай лічбай
Той дзень здалёку зіхаціць.

***

Пад гукі “Зоркі Венеры”
Сёння свой верш твару,
Не пакідаючы верыць:
Спаткаю сваю зару,

Калі, асветлена музай,
Узнавіўшы Максімаў “Санет”,
Іду я сцяжынкай вузкай,
А побач, здаецца, паэт.

У руках свой “Вянок” трымае,
Знаемы да самых драбніц.
У паветры таемнасць вітае,
Ды чуецца гоман крыніц,

Якія нібы спяваюць
Зноў “Слуцкія паясы”…
І да нябёсаў узлятаюць
Птушыныя галасы.

Разносяць яны “Трыялеты”,
Аж наваколле дрыжыць,
І ўсхваляюць паэта,
Натхняюць яго тварыць.

І вось ажывае казка:
Прад намі “Лясун”, “Вадзянік”…
З любоўю і цёплай ласкай
Аўтар да іх пранік.

Ну, а “Маёвай песняй”
Здолеў завараўжыць…
Я прыпынюся ля весніц,
Дзе яго след бяжыць,

Дзесьці знікае ўдалечы,
І да сустрэчы “Зімой”…
Вершам прыроду славячы,
У сэрца нясе спакой.

Многае зразумела,
Ды і натхняе лепш:
Зладжана і ўмела
Аўтар стварае верш.

Так, ён паэт ад Бога,
Лёгка за ім ісці.
Крочу яго дарогай
У творчым сваім жыцці.

# ТРЫЯЛЕТ

Вясна ўжо стукае ў акно
Нясмелым птушак шчабятаннем…
Я цвёрда ведаю адно:
Вясна ўжо стукае ў акно,
Бо ручайкі звіняць даўно…
Як быццам першае прызнанне:
Вясна ўжо стукае ў акно
Нясмелым птушак шчабятаннем…

***

У край чужы паклікала дарога,
Міналі вёскі, сёлы, гарады…
Ды мроіліся родныя парогі,
І сэрца захлынала ад нуды….

Хай скарбніцы раскрыюць мне сталіцы,
Складуць ля ног багацці ўсёй зямлі,
Жыццё аддам за кропелькі вадзіцы
З крыніц, што на Радзіме працяклі.